# ЧАСОВАЕ БЕЛАРУСКАЕ БЮРО ЦК РКП(Б) (ЛЮТЫ–МАЙ 1924 г.): АРГАНІЗАЦЫЙНА-СТРУКТУРНАЯ ПАБУДОВА І ДЗЕЙНАСЦЬ

***А. В. Бараноўскі***

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, sasha9209@mail. ru*

У артыкуле адлюстравана арганізацыйна-структурная пабудова і дзейнасць Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б), якое было створана ў сувязі з вяртаннем у склад БССР усходнебеларускіх тэрыторый і з'яўлялася на працягу лютага–мая 1924 г. кіруючым органам КП(б)Б. Белбюро ЦК РКП(б) праводзіла партыйныя мерапрыемствы ў БССР, а таксама ў межах вернутых у склад Беларускай рэспублікі тэрыторый праз Віцебскі губкам РКП(б) і ўкомы ўз'яднаных з Беларуссю паветаў Гомельскай і Смаленскай губерняў.

***Ключавыя словы:*** Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б); БССР; Віцебская губерня; Гомельская губерня; Смаленская губерня.

# ВРЕМЕННОЕ БЕЛОРУССКОЕ БЮРО ЦК РКП(б) (ФЕВРАЛЬ – МАЙ 1924 г.): ОРГАНИЗАЦИОННО-СТРУКТУРНОЕ ПОСТРОЕНИЕ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ

***А. В. Барановский***

*Институт истории НАН Беларуси,*
*ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, sasha9209@mail. ru*

В статье отражено организационно-структурное построение и деятельность Временного Белорусского бюро ЦК РКП(б), созданного в связи с возвращением в состав БССР восточнобелорусских территорий и являвшегося на протяжении февраля–мая 1924 г. руководящим органом КП(б)Б. Белбюро ЦК РКП(б) проводило партийные мероприятия в БССР, а также в границах возвращенных в состав Белоруской республики территорий через Витебский губком РКП(б) и укомы воссоединённых с Беларусью уездов Гомельской и Смоленской губерний.

***Ключевые слова:*** Временное Белорусское бюро ЦК РКП(б); БССР; Витебская губерния; Гомельская губерния; Смоленская губерния.

# PROVISIONAL BELARUSIAN BUREAU OF THE CENTRAL COMMITTEE OF THE RCP(b) (FEBRUARY – MAY 1924): ORGANIZATIONAL AND STRUCTURAL CONSTRUCTION AND ACTIVITIES

***A. V. Baranouski***

*The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*Academic str., 1, 220072, Minsk, Belarus, sasha9209@mail. ru*

The article reflects the organizational and structural construction and activities of the Provisional Belarusian Bureau of the Central Committee of the RCP(b), created in conjunction with the return of the East Belarusian territories to the BSSR and was the

governing body of the CP(b)B during February–May 1924. The Belarusian Bureau of the Central Committee of the RCP(b) held party events in the BSSR, as well as within the borders of the territories returned to the Belarusian Republic through the Vitebsk Gubkom of the RCP(b) and the ukoms of the counties of Gomel and Smolensk provinces reunited with Belarus.

***Key words:*** Provisional Belarusian Bureau of the Central Committee of the RCP(b); BSSR; Vitebsk province; Gomel province; Smolensk province.

Напрыканцы 1923 г. стала зразумела, што ў хуткім часе ў склад БССР вернецца амаль уся тэрыторыя Віцебскай губерні, а таксама частка Гомельскай і Смаленскай губерняў. Для кіраўніцтва партыйнай працай у межах узʼяднанай Беларусі да бліжэйшай канферэнцыі Палітбюро ЦК РКП(б) 4 лютага 1924 г. прыняла рашэнне стварыць Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б) [1, арк. 6]. Часовае Белбюро ЦК РКП(б) зʼяўлялася вышэйшым кіруючым органам Камуністычнай партыі ў межах узʼяднанай Беларусі і падпарадкоўвалася ЦК РКП(б).

Часовае Белбюро ЦК РКП(б) праводзіла партыйныя мерапрыемствы ў БССР, а таксама ў межах, вернутых у склад рэспублікі тэрыторый Віцебскай губерні, трох паветаў Гомельскай губерні і двух паветаў Смаленскай губерні [1, арк. 6].

Склад Часовага Белбюро ЦК РКП(б) быў зацверджаны 4 лютага 1924 г. Палітбюро ЦК РКП(б). У яго ўвайшлі 13 чалавек: ад ЦК РКП(б) – А. М. Асаткін; ад ЦБ КП(б)Б – В. А. Багуцкі, А. Р. Чарвякоў, Ш. Ш. Ходаш, І. А. Адамовіч, В. А. Нодэль; ад Віцебскага губкама РКП(б) – Э. М. Меднэ, В. У. Дзякаў, В. П. Трунтаяў, Д. Ф. Прышчэпаў; ад Гомельскага губкама РКП(б) – Ф. А. Браўковіч, А. Б. Рыськін; ад Смаленскага губкама РКП(б) – Г. Л. Брансбург (*мал. 1*) [1, арк. 6].

На першым пасяджэнні Часовага Белбюро ЦК РКП(б) быў абраны яго Прэзідыум у складзе пяці членаў і аднаго кандыдата: А. М. Асаткін (сакратар), В. А. Багуцкі, А. Р. Чарвякоў, І. А. Адамовіч, В. У. Дзякаў і Ш. Ш. Ходаш (кандыдат у члены) [2, арк. 5]. Прэзідыум вызначаў парадак дня Белбюро, вёў яго бягучую працу, а таксама меў права прызначэння, перамяшчэння і размеркавання работнікаў. Усе члены Часовага Белбюро ЦК РКП(б), за выключэннем Прэзідыума, выконвалі свае ранейшыя абавязкі на месцах. Абавязкі ўнутры прэзідыума былі размеркаваны 12 лютага 1924 г. наступным чынам: А. М. Асаткін – сакратар, В. А. Багуцкі – загадчык арганізацыйнага аддзела, В. У. Дзякаў – загадчык агітацыйна-прапагандысцкага аддзела. А. Р. Чарвякоў і І. А. Адамовіч уваходзілі ў прэзідыум у якасці членаў Урада БССР. Ш. Ш. Ходаш зʼяўляўся

кандыдатам у члены прэзідыума, як старшыня Часовага Савета Бюро прафсаюзаў [3, арк. 1].

Часовае Белбюро ЦК РКП(б) разглядала найбольш прынцыповыя пытанні, звязаныя з вяртаннем усходнебеларускіх тэрыторый у склад БССР і далейшым кіраваннем уз’яднанай Беларусі. Так, на пасяджэннях 9 і 10 лютага 1924 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Часовага Усебеларускага бюро прафсаюзаў, Часовага Белбюро ЦК РКСМ, аб’яднанай Усебеларускай кантрольнай камісіі [2, арк. 2]. Акрамя таго, Белбюро ЦК РКП(б) 17 сакавіка 1924 г. рэкамендавала праз свае фракцыі персанальны склад Прэзідыума ЦВК БССР, а таксама СНК БССР [4, арк. 4].

Для азнаямлення са станам партыйнай і савецкай работы ў паветы, што вярталіся ў склад БССР, накіроўваліся прадстаўнікі Белбюро: У. Ігнатоўскі і І. Ашэровіч – у Віцебскі і Полацкі паветы, А. Гетнер і З. Жылуновіч – у Аршанскі, М. Стакоўскі і І. Рударман – у Бачэйкаўскі. Было таксама вырашана лічыць неабходнай паездку ў Віцебск А. Асаткіна і А. Чарвякова [5, арк. 2].

Прэзідыум Часовага Белбюро ЦК РКП(б) на сваіх пасяджэннях 21 і 26 лютага 1924 г. заслухаў даклады прадстаўнікоў Белбюро ЦК РКП(б) аб выніках іх паездкі ў Аршанскі, Бачэйкаўскі і Віцебскі паветы. У сувязі з адкліканнем А. Анохіна ў распараджэнне Белбюро ЦК РКП(б), Віцебскаму губвыканкаму было рэкамендавана абраць выконваючым абавязкі старшыні Д. Прышчэпава, а яго намеснікам Л. Праферансава [5, арк. 10].

Часовае Белбюро ЦК РКП(б) ініцыявала шэраг рашэнняў адносна раянавання ўз’яднанай Беларусі. Так, фарміраваннем новай сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення БССР: акруга – раён – сельсавет займалася спецыяльна створаная камісія на чале з І. А. Адамовічам [2, арк. 3].

Белбюро былі прыняты меры для склікання ЦВК БССР Надзвычайнага Усебеларускага з’езда Саветаў (13–16 сакавіка 1924 г.), які канчаткова аформіў ўз’яднанне ўсходнебеларускіх тэрыторый з БССР. Таксама было прынята рашэнне перад XIII з’ездам РКП(б) склікаць VIII з’езд КП(б)Б [2, арк. 4].

Часовае Белбюро ЦК РКП(б) мела наступную арганізацыйна-структурную пабудову:

– агульны аддзел: загадчык аддзела, сакратар, сакратар Прэзідыума, ён жа шыфравальшчык, загадчык фінансава-лічыльным пададдзелам,

справавод, пяць машыністак, два курьеры, два прыбіральнікі, два рахункаводы, загадчык канцылярыі, камендант будынка, шафёр;

– арганізацыйны аддзел: загадчык аддзела (В. А. Багуцкі), намеснік загадчыка аддзела, сакратар, пяць інструктараў, два інфарматары, статыстык, загадчык інфармацыяй;

– улікова-размеркавальны аддзел: загадчык аддзела ( Кроль), намеснік загадчыка аддзела, сакратар, два ўлікоўшчыка, справавод, перапісчык, інструктар;

– аддзел агітацыі і прапаганды: загадчык аддзела (В. У. Дзякаў), намеснік загадчыка аддзела ён жа загадчык пададдзела агітацыі і прапаганды, загадчык пададдзела друку, інструктар пададдзела друку, загадчык пададдзела ўліку, сакратар, справавод;

– аддзел па рабоце сярод жанчын: загадчык аддзела (М. Ф. Муратава), намеснік загадчыка аддзела яна ж сакратар, два інструктары, справавод;

– Яўрэйская секцыя: сакратар (Я. А. Левін), два інструктары, перапісчык;

– Польскае бюро: сакратар (С. Б. Пржедецкая), два інструктары, перапісчык;

– гісторыка-партыйны аддзел: сакратар, перапісчык;

– кантрольная камісія: тры члена камісіі, следчы, тэхнічны сакратар [3, арк. 1, 13].



*Мал. 1* Члены Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б). Сакавік-красавік 1924 г.
Здымак з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея

Друкаваным органам Часовага Белбюро ЦК РКП(б) з'яўляліся газеты «Звезда», «Млот», «Векер», а таксама часопіс «Вперед» [2, арк. 3].

Часовае Белбюро ЦК РКП(б) спыніла існаванне ў сувязі з рашэннем VIII з'езда КП(б)Б (12–14 мая 1924 г.) аб абранні ЦК КП(б)Б [6, арк. 2, 6].

Такім чынам, у лютым–маі 1924 г. кіруючым органам КП(б)Б з'яўлялася Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б), створанае ў сувязі з вяртаннем у склад БССР усходнебеларускіх тэрыторый. Часовае Белбюро ЦК РКП(б) праводзіла партыйныя мерапрыемствы ў БССР, а таксама ў межах вернутых у склад рэспублікі тэрыторый праз Віцебскі губкам РКП(б) і ўкомы ўз'яднаных з Беларуссю паветаў Гомельскай і Смаленскай губерняў.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 17. Воп. 3. Спр. 414.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1271.
3. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1273.
4. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1276.
5. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1274.
6. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1250.